*У. Г. Кулажанка*

# СПЕЦЫФІКА АРГАНІЗАЦЫІ ЦАРКОЎНА-ПРЫХОДСКІХ АРХІВАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў XX ст.

У апошнія дзесяцігоддзі назіраецца немалая цікавасць навукоўцаў-гісторыкаў, а таксама прадстаўнікоў царквы да вывучэння гісторыі царквы і дзяржаўна-царкоўных адносін у XX стагоддзі. У рэчышчы агульных даследаванняў царкоўнай гісторыі XX ст. была ўведзена ў навуковы ўжытак значная колькасць гістарычных дакументаў, якія раскрываюць гісторыю узаемадзеяння царквы і дзяржавы, гісторыю святарства і манаства, гісторыю асобных прыходаў, храмаў, манастыроў, духоўных школ.

Гістарычныя крыніцы па дадзенай тэме можна ўмоўна падзяліць на дзве групы. Першую ўтвараюць фонды дзяржаўных структур, якія займаліся рэалізацыяй дзяржаўнай палітыкі ў адносінах Царквы, а таксама дакументы партыйных органаў і грамадскіх арганізацый па царкоўных пытаннях. Гэта група дакументаў захоўваецца ў дзяржаўных архівах Беларусі і Расіі. Да яе можна таксама аднесці следчыя справы рэпрэсіраванага духавенства і прыхаджан з архіваў органаў дзяржбяспекі.

Другая група складаецца з дакументаў, створаных непасрэдна ў выніку дзейнасці царкоўных структур. Дакументы ўнутрыцаркоўнага справаводства фарміраваліся як на ўзроўні епархіяльных упраўленняў, так і на ўзроўні благачынняў і царкоўных прыходаў. Менавіта дакументальныя крыніцы, створаныя ў выніку дзейнасці Праваслаўнай царквы ў Беларусі, сёння найменш вывучаны. Асабліва гэта датычыць прыходскіх архіваў.

Вядома, што да Кастрычніцкай рэвалюцыі на тэрыторыі Расійскай імперыі, у тым ліку і ў беларускіх епархіях, прыходскае святарства выконвала функцыі па дзяржаўнай рэгістрацыі насельніцтва, яго грамадзянскага стану, займалася зборам статыстычнай інфармацыі на месцах. Святары абавязваліся весці і захоўваць у прыходзе экзэмпляры метрычных кніг, спавядальных роспісаў (ведамасцяў), кліравых ведамасцяў, шлюбных вобыскаў, спісаў прыхаджан. Акрамя таго, святары складалі гісторыка-статыстычныя апісанні свайго прыхода і на рэгулярнай аснове вялі царкоўна-прыходскія летапісы.

У прыходскіх архівах адкладваліся дакументы аб гаспадарча-фінансавай дзейнасці (прыхода-расходныя кнігі, гадавыя справаздачы, дакументы аб рамонтна-будаўнічых работах), перапіска з царкоўнымі і свецкімі ўстановамі, дакументы, якія адносіліся да набажэнскай практыкі: алтарныя кнігі (запісы аб ахвяраваннях), сінодзікі, візітацыйныя запісы, дзённікі набажэнстваў, рукапісныя кнігі запісаў цудаў і надзвычайных здарэнняў і інш.

Разам з бягучымі статыстычнымі і справаводчымі дакументамі некаторыя архівы ўтрымлівалі каштоўныя дакументы XVI—XIX стст., у тым ліку дакументы па гісторыі прыхода (фундушовыя запісы, дароўныя граматы) і

населенага пункта і яго ваколіц. Наяўнасць падобных дакументаў можна прасачыць па гісторыка-статыстычных апісаннях цэркваў і прыходаў, якія складаліся настаяцелямі па адзінай праграме. Адзін з раздзелаў апісання прадугледжваў звесткі пра царкоўны архіў і бібліятэку, адзначаўся перыяд вядзення метрычных кніг, рэгулярнасць запісаў, фізічны стан дакумента.

Значную каштоўнасць маюць царкоўна-прыходскія летапісы канца XIX — пач. XX ст., якія захоўваюцца ў дзяржаўных архівах і ўтрымліваюць звесткі пра склад і захаванасць прыходскага архіва.

Так, напрыклад, у летапісе Дзмітравіцкай Ільінскай царквы Барысаўскага павета, які захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, святар вызначае час заснавання сваёй царквы па фундушах за 1595 і 1604 гг., што захоўваліся ў царкве [1]. У летапісе Лыскаўскай царквы Нараджэння Багародзіцы Ваўкавыскага павета, які захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў г. Гродна, адзначалася, што архіў утрымліваецца спраўна і захоўвае метрычныя кнігі, якія вялі манахі базыльяне з 1717 г. [2], а ў летапісе Доўбенскай Пакроўскай царквы Ашмянскага павета святар пазначыў, што ў архіве прыходскай царквы захоўваюцца візітныя запісы з 1778 г., метрычныя кнігі з 1835 г. і кліравыя ведамасці з 1844 г. [3].

Больш поўнае апісанне архіва ўтрымліваецца ў летапісе Чарнаўчыцкай царквы Святой Параскевы Брэсцкага павета, дзе быў зроблены пералік дакументаў прыходскага архіва. Сярод іх згадваліся копіі фундушоў, напісаныя «на рускай мове таго часу» за 1543 і 1566 гг. Некаторыя тэксты былі прыведзены поўнасцю, у тым ліку згаданыя фундушы, а таксама хадайніцтва князя Марціна Радзівіла аб прызначэнні ў царкву святара Пятра Айновіча 1687 г., выпіска з кніг гродскіх Брэсцкага павета за 1682 г., візітацыйныя акты за 1725—1802 гг. і інш. Усяго 13 дакументаў [4].

Трэба адзначыць, што да пачатку XX ст. у прыходах не было сфарміравана сістэмы ўліку і захавання царкоўных дакументаў. У многіх прыходах не было належных умоў для захавання дакументаў, у тым ліку старажытных. Нярэдка іх стан выклікаў сур'ёзную занепакоенасць даследчыкаў таго часу. Апеку над царкоўнымі дакументамі павінны былі ўзяць на сябе архіўна-археалагічныя камісіі, створаныя пры Сінодзе ў 1914 г., а пазней і пры духоўных кансісторыях.

Пачатак Першай сусветнай вайны і наступныя за ёй буйныя сацыяльныя катаклізмы перарвалі пачатак фарміравання навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці царкоўных архіваў. Першай падзеяй, якая катастрафічна паўплывала на стан прыходскіх архіваў, стала эвакуацыя царкоўнай маёмасці з прыходаў Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў у глыб Расіі. Эвакуацыі падлягала ўся царкоўная маёмасць: іконы, набажэнскія кнігі, званы, метрычныя кнігі, харугвы і набажэнскія прылады.

Большасць маёмасці патрапіла ў Маскву, на Цэнтральны склад эвакуіраваных рэчаў Заходняга краю, адкуль яны размяркоўваліся па цэрквах і ма-

настырах. Маёмасць беларускіх прыходаў захоўвалася ў маскоўскіх Аляксееўскім, Андроніеўскім, Данілавым, Златавустаўскім, Навадзевічым, Новаспаскім, Сіманаўскім, Чудавым манастырах, храме Хрыста Збавіцеля, цэрквах Мікалая, Святой Тройцы і інш. Значная частка маёмасці трапіла ў Саратаў, Разань і іншыя расійскія гарады. Можна толькі гіпатэтычна меркаваць, што большая частка гэтай маёмасці была страчана ў наступныя бурныя дзесяцігоддзі, а прасачыць за лёсам тых, якія захаваліся, надзвычай складана.

Пасля рэвалюцыйных падзей 1917 г. усе архіўныя дакументы Рускай праваслаўнай царквы згодна з Дэкрэтам СНК РСФСР ад 1 чэрвеня 1918 г. «Аб рэарганізацыі і цэнтралізацыі архіўнай справы ў РСФСР» былі аб'яўлены часткай Дзяржаўнага архіўнага фонду (ДАФ). Значная колькасць дакументаў Свяцейшага Сінода, духоўных кансісторый, манастыроў і цэркваў перадаваліся ў дзяржаўныя архівасховішчы. Асаблівага размаху дасягнула гэта акцыя падчас кампаній па канфіскацыі царкоўнай маёмасці і масавага закрыцця храмаў у 1920—1930-я гг.

У выніку Дэкрэта СНК РСФСР ад 20 студзеня 1918 г. «Аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы» Царква фактычна была прыроўнена да «прыватных таварыстваў і саюзаў», адпаведна і царкоўныя дакументы, створаныя пасля ўступлення ў дзеянне гэтага Дэкрэта, не адносіліся да ДАФ і з'яўляліся маёмасцю Праваслаўнай царквы. Праўда, утвораная на Маскоўскім саборы 1917 г. патрыярхія да 1927 г. не прызнавалася ўладамі. Легальна маглі існаваць толькі рэлігійныя абшчыны, якім мясцовыя ўлады прадстаўлялі ў карыстанне нацыяналізаваныя царкоўныя будынкі і іншую маёмасць [5, с. 114].

У чэрвені 1917 г. Свяшчэнны Сінод прыняў «Часовае палажэнне аб праваслаўным прыходзе», якім было ўстаноўлена прыходскае самакіраванне. Ва ўмовах надання прыходам правоў шырокай аўтаноміі і адсутнасці сталай цэнтралізаванай царкоўнай улады, настаяцелі прыходаў і вернікі паступова прыстасоўваліся да новых умоў. У прыходскіх абшчынах складваліся дакументы, звязаныя з выбарамі царкоўнага савета і царкоўнага актыву (так званай «дваццаткі»), якія заключалі дамовы з мясцовымі ўладамі на карыстанне царкоўным будынкам. Царкоўныя абшчыны вялі фінансава-гаспадарчыя дакументы, перапіску, мелі свае пячаткі. У адносінах да статыстычных дакументаў 1920-я гг. былі пераходным перыядам. Метрычныя кнігі былі адменены законам, але іх вядзенне працягвалася да стварэння на месцах органаў ЗАГС, куды перадаваліся кнігі [6, с. 32—33]. Некаторыя святары традыцыйна працягвалі вядзенне царкоўна-прыходскіх летапісаў, кніг ахвяраванняў, складанне паслужных спісаў і інш.

Аднак прававое становішча прыходаў паступова пагаршалася. Згодна з пастановай УЦВК і СНК РСФСР ад 8 красавіка 1929 г. «Аб рэлігійных аб'яднаннях» перад рэлігійнымі абшчынамі было пастаўлена шмат абмежаванняў і рэгламентаваных умоў, а ў 1930-х гг. савецкая ўлада ўзяла курс на поўную ліквідацыю Праваслаўнай царквы ў СССР. Фактычна напярэдадні Другой су-

светнай вайны на тэрыторыі БССР не было пастаянна дзеючых цэркваў, у 1939 г. была зачынена апошняя царква ў Мінскай епархіі. Архівы прыходаў падзялялі лёс храмаў, з дакументаў гэтага перыяду захаваліся адзінкі, якія трапілі ў дзяржаўныя архівы або знаходзяцца ў прыватных зборах.

Па-іншаму складвалася сітуацыя ў Заходняй Беларусі, дзе прыходы і манастыры ўваходзілі ў склад Польскай аўтакефальнай Праваслаўнай царквы і дзе царкоўнае жыццё не перапынялася. У прыходах вяліся і захоўваліся дакументы, пераважна па дарэвалюцыйным узоры на рускай мове, а ў 1930-я гг. у справаводстве пачала ўжывацца польская мова. Трэба зазначыць, што дзякуючы мірным умовам існавання праваслаўных прыходаў у складзе Польскай дзяржавы, захаваліся не толькі архівы, але і царкоўныя будынкі і кадры духавенства, якія пазней займаліся адраджэннем разбуранага царкоўнага жыцця ва Усходняй Беларусі.

Як вядома, ажыўленне царкоўнага жыцця Беларусі пачалося ў час нямецкай акупацыі. Была аднаўлена царкоўная іерархія, масава адкрываліся храмы. Спецыфіка справаводства таго часу заключалася ў тым, што, паводле рашэння Сабору беларускіх епіскапаў, частка дакументаў вялася па-беларуску [7]. Захаваліся адзінкавыя дакументы, якія адлюстроўваюць спецыфіку царкоўнага жыцця таго перыяду.

Пасляваенны перыяд (1944—1948) адрозніваўся лібералізацыяй адносін Царквы і дзяржавы, што адбілася на стане прыходаў і, адпаведна, на стане бягучай дакументацыі. Пасля вызвалення Беларусі на яе тэрыторыі налічвалася 1044 дзеючых праваслаўных храмаў [8]. Існавалі чатыры епіскапскія кафедры: у Мінску, Брэсце, Гродне і Пінску. Разам з устанаўленнем новай царкоўнай структуры адбываўся пераход дзейнасці прыходаў на «Палажэнне аб кіраванні РПЦ», зацверджанае на Памесным саборы 31 студзеня 1945 г. Не менш важным стала стварэнне пры СНК СССР Савета па справах Рускай праваслаўнай царквы, а таксама апаратаў яго ўпаўнаважаных па абласцях і рэспубліках, якія адказвалі за сувязь царкоўных структур з уладамі.

Урадам СССР у 1943—1945 гг. быў прыняты шэраг пастаноў, якія надавалі царкоўным структурам статус юрыдычнай асобы, што дазваляла абшчынам адкрываць банкаўскія рахункі, набываць і арандаваць маёмасць і г. д.

У першыя пасляваенныя гады ўлады правялі кампаніі па рэгістрацыі духавенства і царкоўных абшчын, было праведзена афармленне карыстання храмавымі будынкамі вернікамі. Улады не супрацьдзейнічалі правядзенню святкаванняў вялікіх рэлігійных святаў, хрэсных хадоў і інш. Была аднаўлена дзейнасць Мінскай духоўнай семінарыі, арганізоўваліся часовыя пастырска-багаслоўскія курсы. Гэта дазваляла пачаць аднаўленне царкоўнага жыцця ва Усходняй Беларусі і захоўваць формы прыходскага жыцця, якія існавалі да 1939 г. у Заходняй Беларусі.

Пэўная ўвага надавалася і прыходскім архівам. Так, на канферэнцыі выкладчыкаў і слухачоў пастырска-багаслоўскіх курсаў у г. Гродне ў 1946 г.

епіскап Гродзенскі Варсанофій выказваўся аб неабходнасці аднаўлення вядзення ў прыходах царкоўных летапісаў і візітацыйных кніг. Да сённяшняга часу захаваліся некаторыя прыходскія летапісы (Сафійскага сабора ў г. Гродна, у в. Мураванка Шчучынскага р-на і інш.), дзе запісы вяліся ў пасляваенныя гады.

Па-ранейшаму вёўся ўлік абраднасці, аднак асаблівасцю была зацікаўленасць у гэтым з боку органаў улады. Ужо ў 1947—1948 гг. Упаўнаважаны Савета па справах РПЦ В. Мянькоў выказаў патрабаванне архіепіскапу Мінскаму і Беларускаму Піціргыму аб абавязковай рэгістрацыі здзяйсняемых абрадаў хрышчэння, вянчання, адпявання памерлых, што рабілася з мэтай дзяржаўнага кантролю над вернікамі. І хоць паводле Палажэння аб Савеце па справах РПЦ Упаўнаважаныя ў той час не мелі права ўмешвацца ва ўнутраныя справы Царквы, «некаторыя ўпаўнаважаныя і прадстаўнікі ўладаў (Бабруйск) бралі ў духавенства царкоўныя запісы аб асобах, якія здзяйснялі тыя ці іншыя царкоўныя абрады, нават праводзілі з гэтай мэтай вобыскі дома ў святара (Докшыцкі р-н Полацкай вобл.)» [9]. На той момант падобныя парушэнні сталі прычынай звальнення ўпаўнаважаных па Бабруйскай, Гомельскай і Палескай абласцях. Аднак з цягам часу непасрэдны кантроль за правядзеннем абрадаў і асобамі, якія ў іх удзельнічалі, быў узаконены, з 1962 г. у кожнай царкве павінны былі быць «кнігі ўліку абраднасці», да якіх маглі звяртацца ўпаўнаважаныя і мясцовыя ўлады.

У другой палове 1950-х і асабліва ў 1960-я гг. назіраецца зварот да метадаў поўнага адміністрацыйнага кантролю над духавенствам. У 1960-я гг. упершыню пачала здзяйсняцца мэтанакіраваная масавая кадравая селекцыя духавенства, адбывалася ўмяшанне ў справы прыходаў і набажэнскую практыку.

Пад ціскам дзяржавы Архірэйскі сабор РПЦ 1961 г. пагадзіўся са змушанай мерай — прыняў новую арганізацыю прыходскага кіравання, па якой настаяцель і клір адхіляліся ад удзелу ў прыходскім сходзе і прыходскім савеце і абмяжоўваліся толькі «духоўным кіраўніцтвам сваіх пасомых». Рэформа прыходскага кіравання значна падарвала аўтарытэт святара і ўнесла вялікія праблемы ў прыходскае жыццё.

Нярэдкімі былі выпадкі прыніжэння годнасці святара з боку савета, што адлюстравана і ў прыходскіх дакументах. Так, у в. Ляўшова Ваўкавыскага благачыння «царкоўны савет перабольшыў свае паўнамоцтвы, палічыў свяшчэнніка радавым батраком, прызначыўшы яму штомесячную зарплату ў 30 рублёў, у той час, як царкоўнаму старасту ён прызначыў 80 рублёў у месяц» [10].

Галоўным дакументам у прыходскім архіве стала дамова, паводле якой святар наймаўся абшчынай для «выканання рэлігійных трэбаў». Акрамя таго, прыходскія дакументы ўключалі ў сябе рэгістрацыйныя дакументы на абшчыну, дамову з райвыканкамам, спісы прыхаджан і анкеты царкоўнага

савета, анкету на царкоўнаслужыцеляў, а таксама дакументы асабістага паходжання — указ аб прызначэнні святара і даведка на права служэння ад Упаўнаважанага. Абавязковымі для вядзення былі касавыя кнігі, кнігі хрышчэнняў, кнігі вянчанняў, кнігі пахаванняў, кніга ахвяраванняў.

Вялі прыходы перапіску з вышэйстаячымі царкоўнымі структурамі, якая ўключала справаздачы, звесткі пра храм (вопісы маёмасці, тэхнічны стан будынка), прашэнні, скаргі і адлюстроўвала праблемы і спецыфіку тагачаснага жыцця. Прытым трэба адзначыць, што Упаўнаважаным і дзяржаўным структурам не рэкамендавалася ўступаць у афіцыйную перапіску з духавенствам. Таму святары звярталіся да епіскапа, а той у сваю чаргу звяртаўся да Упаўнаважанага.

Такім чынам, стан і захаванасць прыходскіх архіваў знаходзіліся ў залежнасці ад характару дзяржаўна-царкоўных адносін на розных этапах. Пэўны час прыходы часткова захоўвалі элементы традыцыйнай сістэмы справаводства, а таксама паступова ўводзілі новыя віды дакументаў. Аднак у савецкі час прыходы не мелі замацаванай сістэмы справаводства. Сур'ёзныя страты архівы панеслі падчас ваенных падзей, а таксама акцыі па масавым закрыцці цэркваў. Таму дакументы прыходскіх архіваў сёння захаваліся фрагментарна. Прасачыць за лёсам захаваўшыхся цяжка, напрыклад, пры закрыцці цэркваў у 1960-х гг. па распараджэнні царкоўных улад маёмасць і архівы закрытых цэркваў перадаваліся ў суседнія храмы. Некаторыя дакументы перадаваліся ў архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення. Сёння частка дакументаў працягвае захоўвацца ў прыходах і ў прыватных асоб.

У апошні гады даследчыкамі, пераважна выпускнікамі духоўных школ, робяцца спробы апісання прыходскіх, манастырскіх і благачынных архіваў. Пытанні захавання дакументаў прыходскіх архіваў выклікаюць неабходнасць наладжвання сталага супрацоўніцтва архівістаў, гісторыкаў і прадстаўнікоў царквы па наладжванні адпаведнай сістэмы ўліку і захавання дакументаў прыходскіх архіваў.

## Крыніцы і літаратура


1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). — Фонд 114. — Воп. 1 — Адз. зах. 1 — Л. 2. Царкоўна-прыходскі летапіс Дзмітраўскай Ільінскай царквы Барысаўскага павета. 1867—1916.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (НГАБ у г. Гродна) — Фонд 363. — Воп. 2. — Адз. зах. 1. — Л. 5 зв. Царкоўна-прыходскі летапіс Лыскаўскай царквы Нараджэння Багародзіцы Ваўкавыскага павета. 1880—1813 гг.
3. НГАБ у г. Гродна. — Фонд 1696 — Воп. 1. — Адз. зах. 1. — Л. 2 зв. Царкоўна-прыходскі летапіс Свята-Пакроўскай царквы ў Даўбенях Віленскай губерні Ашмянскага павета, 1880 г.
4. НГАБ у г. Гродна. — Фонд 429. — Воп 1. — Адз. зах. 8. — Л. 2—6 зв. Царкоўна-прыходскі летапіс Чарнаўчыцкай царквы Брэсцкага павета, 1882—1907 гг.
5. Мазырин, А. В. Легализация Московской патриархии в 1927 г. скрытые цели власти // Отечественная история. — № 4. — 2008.
6. Антонов, Д. Н., Антонова, И. А. Метрические книги России XVIII — начала XX в. — М. «Рос. гос. гуманит. ун-т», 2006. — 385 с.

7. Гл.: Силова С. Белорусская Православная Церковь во время войны. — Гродно: ГрГУ, 2003. — 105 с.
8. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Фонд 951. — Воп. 3. — Адз. зах. 3. — Л. 92. Інфармацыйная справаздача, 1944.
9. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. — Фонд 478. — Воп. 2. — Адз. зах. 7. — Л. 6—7 Пісьмо ўпаўнаважанага Савета па справах РПЦ пры СМ СССР па Беларускай ССР, 1945
10. Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення. — Фонд 1. — Воп. 1. Справа Ваўкавыскага благачыння, 1962 г